ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар установы адукацыі
«Беларуская дзяржаўная
акадэмія мастацтваў»
_______________ А.М. Каласоўская
4 чэрвеня 2026 г.

# ВОДГУК АПАНІРУЮЧАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»
на дысертацыю А.М. Сінілы «Сюжэтна-тэматычныя асаблівасці жывапісу
з даваенных калекцый музеяў Мінска», прадстаўленую на суісканне вучонай
ступені кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 –
выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура

**Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі.** Дысертацыйнае даследаванне А.М. Сінілы «Сюжэтна-тэматычныя асаблівасці жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска» па тэме і зместу адпавядае заяўленай галіне навукі «мастацтвазнаўства», па якой яна прадстаўлена да абароны, і пашпарту спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура. Адпаведнасць тэмы і зместу дысертацыі заяўленым галіне і спецыяльнасці пацвярджаецца тым, што асноўным зместам дысертацыі з'яўляецца выяўленне сюжэтна-тэматычных асаблівасцей беларускага, рускага і заходнееўрапейскага жывапісу XVI ст. – першай паловы XXI ст.

Дысертацыя выканана ў ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі» ў рамках навукова-даследчай работы аддзела архітэктуры філіяла «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы» і па сваёй тэматыцы адпавядае прыярытэтным напрамкам беларускай мастацтвазнаўчай навукі. Работа выканана ў адпаведнасці з заданнем 1.2.01 «Архітэктурная і гісторыка-культурная спадчына ў развіцці традыцый і культурнай ідэнтычнасці Беларусі» (ГР 20160101 ад 15.02.2016 г.), дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гг. «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» (падпраграма 12.1 «Гісторыя і культура»), а таксама згодна з планавай НДР 12.2.1.1 «Архітэктурны і гісторыка-культурны ландшафт Беларусі як фактар устойлівага развіцця грамадства і дзяржавы» ў рамках выканання дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» (падпраграма «Культура і мастацтва») на 2021–2025 гг. (ГР 20210571 ад 08.04.2021 г.). Тэма дысертацыі адпавядае пункту 6 «Забяспечэнне бяспекі чалавека, грамадства і дзяржавы» з пераліку прыярытэтных напрамкаў фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2021–2025 гг., зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 мая 2020 года № 156.

Дысертацыя складаецца з трох главаў, у якіх паслядоўна раскрываецца праблематыка, пазначаная ў задачах даследавання. У першай главе праводзіцца агляд гістарыяграфіі пытання, аналіз крыніцазнаўчай базы і метадалогіі даследавання, вызначаюцца прынцыпы фарміравання калекцый жывапісу Мінскага сацыяльна-гістарычнага музея і Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР. У другой главе характарызуюцца стылістыка беларускага шляхецкага партрэта XVIII – пач. XX ст. і асаблівасці беларускага жывапісу XIX ст. – першай паловы XX ст. У трэцяй главе выяўляюцца тэматычна-вобразныя асаблівасці жывапісных работ, створаных заходнееўрапейскімі аўтарамі ў XVI–XIX стст. і рускімі мастакамі XVIII – пач. XX ст. Кожная глава завяршаецца аргументаванымі высновамі. На аснове вывучэння тэарэтычнага матэрыялу (206 найменняў на беларускай, рускай, украінскай, польскай, нямецкай і англійскай мовах) і беларускага, расійскага і сусветнага вопыту ў дысертацыі выяўлены перспектыўныя падыходы да аднаўлення важных аспектаў гісторыі беларускага, рускага і заходнееўрапейскага мастацтва, да навукова-даследчага запаўнення тых лакун, якія сталі вынікам мастацкіх страт Другой сусветнай вайны.

Тэкст дысертацыі напісаны па-беларуску, з захаваннем нормаў навуковага стылю мовы. Афармленне дысертацыі і аўтарэферата адпавядае патрабаванням ВАК Беларусі. Аўтарэферат адлюстроўвае змест дысертацыі, у ім прадстаўлены асноўныя вынікі даследавання і навукова абгрунтаваныя палажэнні, якія выносяцца на абарону.

Актуальнасць навуковай працы, выкананай суіскальнікам, заключаецца ў выяўленні сюжэтна-тэматычных асаблівасцей жывапісу розных школ і стыляў, а таксама ў дапаўненні ведаў пра мастацкія творы, якія захоўваліся ў даваенным Мінску. Новая інфармацыя, атрыманая даследчыкам, дазваляе вярнуць шматлікія жывапісныя творы ў кантэкст беларускага мастацтвазнаўства, нават калі яны былі незваротна страчаныя, альбо захоўваюцца ў замежных зборах.

На аснове аналіза архіўных дакументаў, каталогаў выставак, фотаздымкаў саміх твораў і экспазіцый музеяў, многія з якіх раней былі невядомы даследчыкам, суіскальнік упершыню атрыбутаваў і ўвёў у навуковы зварот больш за 100 карцін з даваенных калекцый музеяў Мінска. Па выніках даследавання складзена база пазначэнняў (нумары, надпісы, пячаткі, наклейкі) на творах жывапісу, што істотна павышае шанцы выявіць творы з беларускіх калекцый у замежных зборах. Абапіраючыся на пазначэнні, захаваныя на карцінах, суіскальнік адшукаў у замежных зборах Ізраіля, Польшчы, Расіі, Украіны мастацкія творы з калекцый Беларусі, якія лічыліся страчанымі.

**Навуковы ўклад суіскальніка ў распрацоўку навуковай праблемы з ацэнкай яго значнасці.** Дысертацыя А.М.Сінілы дазваляе казаць аб з'яўленні комплекснага даследавання, дзе ўпершыню ў гісторыі беларускага мастацтвазнаўства выяўлены і сістэматызаваны жанравая структура і тэматычна-вобразныя асаблівасці твораў беларускага і замежнага жывапісу з даваенных калекцый мінскіх музеяў. Зроблена база пазначэнняў на творах жывапісу з даваенных калекцый мінскіх музеяў, якая дазваляе прасачыць пасляваенныя перамяшчэнні твораў і даказаць паходжанне прадметаў з беларускіх калекцый.

Уведзена ў навуковы ўжытак вялікая колькасць раней невядомых твораў, многія з якіх лічыліся незваротна страчанымі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Праведзена атрыбуцыя больш чым 100 твораў (вызначаны імёны намаляваных асоб, аўтараў, правенанс, сучаснае месцазнаходжанне) з даваенных калекцый музеяў Мінска. Атрыбутаваны творы са збораў НММ РБ і НГМ РБ, музеях Расіі, Украіны, Ізраіля, Польшчы.

У дысертацыйным даследаванні прааналізавана вялікая колькасць твораў рэлігійнай і свецкай тэматыкі, напісаных заходнееўрапейскімі, рускімі і беларускімі мастакамі, што дазволіла вызначыць сюжэтна-тэматычныя асаблівасці мноства работ, у тым ліку тых, якія сёння страчаны. Суіскальнікам выяўлена, што Мінскі сацыяльна-гістарычны музей і Дзяржаўная карцінная галерэя БССР мелі найбольш значныя калекцыі жывапісу па якасці і колькасці экспанатаў. Паводле храналагічных дадзеных, вызначаных аўтарам даследавання, фарміраванне калекцый жывапісу Мінскага сацыяльна-гістарычнага музея і Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР адбывалася на працягу 1919–1940 гг. і ўключала тры этапы, якія вылучаюцца на аснове прынцыпаў камплектавання: 1919–1921 гг. (калекцыі ўстаноў і нацыяналізаваных маёнткаў); 1921–1939 гг. (творы з мастацкіх выставак і навуковых экспедыцый, перадач з устаноў Расіі); 1939–1940 гг. (дзяржаўная закупка і паступленні з тэрыторыі Заходняй Беларусі, стварэнне ДКГ БССР).

Суіскальнікам устаноўлена, што ў выніку падзей Вялікай Айчыннай вайны значная частка твораў жывапісу была страчана (захавалася прыкладна 100 карцін з абодвух музеяў), зніклі многія ўліковыя дакументы, што робіць праблему аднаўлення сюжэтна-тэматычных асаблівасцей вельмі складанай. Даследаванне выканана на падставе віртуальнай рэканструкцыі збораў праз аналіз захаваных твораў каталогаў выставак і перыядычных выданняў, інвентарных кніг і дакументаў перадач твораў у калекцыі музеяў, архіўных фотаздымкаў. Вызначана, што ў зборах МСГМ дамінавалі шляхецкія партрэты і творы гістарычнага жанру, а ў ДКГ БССР аддавалі перавагу творам вядомых мастакоў у розных жанрах.

Значнасць навуковага ўкладу суіскальніка ў вырашэнне актуальнай навуковай праблемы заключаецца ў выдзяленні найбольш характэрных сюжэтна-тэматычных, мастацка-вобразных і жанравых асаблівасцей многіх жывапісных твораў вельмі працяглага часу: XVI ст. – першай паловы XX ст. Выяўлена стылістычная спецыфіка твораў заходнееўрапейскіх, беларускіх, рускіх мастакоў эпохі Рэнесансу і барока, у стылі класіцызму, рамантызму, рэалізму. Вызначаны прыклады жывапісу мадэрнізму пачатку XX ст. і далейшых стылістычных змен у мастацтве, абумоўленых сацыяльна-палітычным характарам развіцця беларускага грамадства. Атрымалі мастацтвазнаўчую характарыстыку творы вялікіх майстроў жывапісу розных стагоддзяў, а таксама былі ўпершыню прадстаўлены прыклады жывапісу раней невядомых майстроў, што дапаўняе агульную карціну развіцця мастацкага працэсу і павышае ролю і значэнне мінскіх калекцый на міжнародным узроўні.

Выдзеленыя суіскальнікам актуальныя падыходы да аднаўлення звестак аб творах калекцый пры дапамозе супастаўлення і сістэматызацыі розных крыніц інфармацыі, выкарыстанні неабходнай атрыбутацыі, архіўных

фотадакументаў і да т.п. могуць знайсці прымяненне ў распрацоўцы шырокага спектра праектаў музейна-экспазіцыйных інавацый.

Вынікі дысертацыйнага даследавання А.М. Сінілы ўжо выкарыстоўваюцца ў экспазіцыйнай, экскурсійнай і выставачнай дзейнасці Нацыянальнага музея-запаведніка «Нясвіж», Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, Дзяржаўнай гісторыка-культурнай установы «Гомельскі палацава-паркавы ансамбль», Омскага абласнога музея выяўленчых мастацтваў ім. М.А. Врубеля, Наўгародскага музея-запаведніка.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў даследавання**. Практычная значнасць работы пацверджана трыма актамі аб практычным выкарыстанні навуковых вынікаў даследавання, прыкладзенымі да дысертацыі, што сведчыць аб пачатках ўкаранення матэрыялаў дысертацыі ў навукова-даследчы працэс. З іх адзін акт суадносіцца з укараненнем матэрыялаў даследавання ў дзейнасць установы культуры «Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь», іншы – з выкарыстаннем практычных распрацовак у дзейнасці Дзяржаўнай установы «Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж»», трэці – з выкарыстаннем практычных распрацовак у дзейнасці Дзяржаўнай гісторыка-культурнай установы «Гомельскі палацава-паркавы ансамбль».

Суіскальнікам выяўлены прыклады шматлікіх твораў жывапісу айчынных і замежных мастакоў розных стыляў, школ і перыядаў, якія дазваляюць уключыць гэтыя адкрыцці ў глабальны культурны кантэкст, што можа знайсці прымяненне ў мастацтвазнаўчых публікацыях, энцыклапедычных выданнях, праграмах развіцця турызму, музейнай дзейнасці, даведачнай літаратуры і прэзентацыйных матэрыялах аб культуры Беларусі.

Суіскальнікам уключана ў навуковы ўжытак вялікая колькасць раней невядомых архіўных дакументаў: актаў перадач, інвентарных кніг, фотаздымкаў экспазіцый музеяў, выставак, інтэр'ераў сядзіб і твораў з калекцый МСГМ і ДКГ БССР, што дапамагае не толькі прааналізаваць асобна ўзятыя творы, але і самі музейныя калекцыі ў цэлым. Комплексны падыход даследавання дазволіў пераадолець абмежаванасць ўспрыняцця тэмы даваенных калекцый як немагчымай для паўнацэннага аналізу.

Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць прыдатнымі для падрыхтоўкі навуковых і навукова-метадычных работ па гісторыі даваенных калекцый жывапісу музеяў Мінска, у выставачнай і экскурсійнай дзейнасці, падрыхтоўцы экспазіцый, атрыбуцыі твораў жывапісу, пры складанні баз дадзеных твораў, страчаных у гады Вялікай Айчыннай вайны; пры іх пошуку. Выяўленая навуковая база страчаных твораў са збору ДКГ БССР можа быць выкарыстана ў дзейнасці міжведамаснай камісіі па вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцяў, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь.

Пералічаныя матэрыялы могуць быць уключаны ў праграмы падрыхтоўкі студэнтаў мастацкіх спецыяльнасцей і выкарыстаны ў навучальным курсе такіх дысцыплін, як «Уводзіны ў мастацтвазнаўства», «Гісторыя сусветнага выяўленчага мастацтва», «Гісторыя мастацтва Беларусі».

**Заўвагі па дысертацыі і аўтарэферату:**

1. Суіскальнік выяўляе ў даследаванні вялікую колькасць твораў беларускага жывапісу розных стагоддзяў, якія добра захаваліся і належаць да розных жанраў і стыляў. Ён слушна вызначае іх як высокамастацкія (с. 61). Жадана было б звярнуць увагу на найбольш значныя, і даць ім, разам з дакладнай атрыбутацыяй і агульным апісаннем, больш разгорнутую мастацтвазнаўчую характарыстыку асаблівасцей стылістыкі, ідэйна-вобразнага раскрыцця тэмы, каларыстычнага вырашэння.

2. У абагуленай характарыстыцы творчасці вядомых італьянскіх мастакоў XVII-XVIII стст., творы якіх знаходзіліся ў беларускіх музеях, жадана падкрэсліваць іх належнае месца ў гісторыі мастацтва. Напрыклад, Пампеа Батоні быў не проста прадстаўніком рымскай школы, але і самым паспяховым жывапісцам памяркоўнага класіцызму свайго часу; Даменіка Феці не толькі пісаў творы на біблейскія тэмы, але быў выдатным паслядоўнікам Караваджа, стваральніка стылю барокка і г. д. (с. 78) Гэта яшчэ больш сведчыла б аб вялікай каштоўнасці калекцый еўрапейскага мастацтва, якія былі сабраныя ў мінскіх музеях даваеннага перыяду.

3. Ёсць неабходнасць удакладненняў істотных звестак з жыцця і творчасці асобных беларускіх і рускіх мастакоў. Як адзначае суіскальнік на с. 52, вядомы беларускі мастак Зянон Аляксандравіч Ленскі (1864–1927) стварыў партрэт «мадрыдскага карліка» пад уплывам твораў Веласкеса. Гэта з'яўляецца істотным прыкладам творчага дыялогу з мастацтвам вялікага іспанскага жывапісца. Таму неабходна ўдакладніць лёс гэтага твора і крыніцы, у якіх суіскальнік знайшоў такую важную інфармацыю.

Сяргей Канстанцінавіч Заранка (1818–1870) з'яўляецца вядомым рускім мастаком XIX ст. Таму недастаткова сказаць у тэксце даследавання, што ён «паходзіць з беларускіх зямель» (с. 93). Ён нарадзіўся ў сям'і прыгоннага селяніна ў в. Ляды Магілёўскай губерні. Атрымаўшы афіцыйнае вызваленне, яго сям'я пераехала ў сталіцу расійскай імперыі, дзе ён пачаў вучыцца прафесійнаму мастацтву.

Авель Ільіч Левітан (1861-1933) – старэйшы брат вялікага пейзажыста Ісаака Ільіча Левітана. Вучыўся ў Маскве ў В.Г. Пярова, І.М. Прانішнікава, А.К. Саўрасава. За вучнёўскія работы ў 1876 і 1878 гг. быў узнагароджаны малымі срэбранымі медалямі. Яго творы знаходзяцца ў Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі. Такая дадатковая інфармацыя магла бы знайсці сваё месца на с. 104.

4. Папулярныя і ўжо агульнавядомыя тлумачэнні біблейскіх сюжэтаў пра Руф, Сусанну і Давіда, якія займаюць празмернае месца на старонках дысертацыі, магчыма, не маюць асаблівага значэння для раскрыцця тэмы даследавання. Іх можна было б мінімізаваць на карысць іншым істотным звесткам і характарыстыкам, улічваючы усталяваную колькасць дысертацыйных старонак.

5. Можна заўважыць у тэксце шэраг дробных апісак і недакладнасцей: «узнікалі карціны» замест «ствараліся карціны» (с. 72), «школа Перуджына» замест «школы Перуджына (XV–пач. XVI стст.)» (с. 74), «мастакі Залатога веку» замест «мастакі залатога веку», «атрыбуты пасады» замест «атрыбуты ўлады» (с. 89), «пісалі бытавы жанр» замест «пісалі ў бытавым жанры» (с. 93), «валіфарматны» замест «вялікафарматны» (с. 109).

**Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія суіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень кандыдата мастацтвазнаўства.**

У дысертацыі ўпершыню ў беларускім мастацтвазнаўстве праведзена комплекснае даследаванне сюжэтна-тэматычных асаблівасцей жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска.

Асноўныя палажэнні і высновы дысертацыі А.М. Сінілы былі апрабаваны на 27 міжнародных і 6 рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцыях і знайшлі адлюстраванне ў 8 артыкулах у рэцэнзуемых навуковых часопісах і зборніках, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь (4,88 аўт. арк.); у 6 артыкулах у зборніках навуковых прац і часопісах (2,88 аўт. арк.), у 8 артыкулах у зборніках матэрыялаў канферэнцый (5,54 аўт. арк.), у 1 даведачным выданні (8,5 аўт. арк.), у 3 артыкулах у гістарычных і мастацкіх журналах. Агульны аб'ём публікацый – 22,33 аўт. арк. Усе навуковыя артыкулы, якія асвятляюць вынікі дысертацыі, напісаны без суаўтарства.

А.М. Сініла заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура за:

– сістэматызацыю жанравай структуры і мастацтвазнаўчую характарыстыку тэматычна-вобразных асаблівасцей твораў беларускага, рускага і заходнееўрапейскага жывапісу з даваенных калекцый мінскіх музеяў;

– атрыбуцыю больш за 100 жывапісных твораў з даваенных калекцый музеяў Мінска;

– увядзенне ў навуковы зварот вялікай колькасці раней невядомых архіўных дакументаў са сховішч Расіі, Польшчы, Германіі, ЗША пра творы жывапісу, якія знаходзіліся ў калекцыях Мінскага сацыяльна-гістарычнага музея і Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР;

– стварэнне базы пазначэнняў на творах жывапісу з даваенных збораў музеяў Мінска.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі суіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Экспертыза прадстаўленай да абароны кандыдацкай дысертацыі А.М. Сінілы дазваляе зрабіць выснову аб тым, што вызначаная мэта даследавання – «выяўленне сюжэтна-тэматычных асаблівасцей твораў жывапісу з даваенных калекцый Мінскага сацыяльна-гістарычнага музея і Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР» (стар. 6 дысерт. і стар. 2 аўтарэферата) дасягнута.

Дысертацыю А.М. Сінілы «Сюжэтна-тэматычныя асаблівасці жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска», прадстаўленую на суісканне вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04, у цэлым трэба ацаніць як першае комплекснае даследаванне, якое змяшчае новыя, навукова абгрунтаваныя высновы, сукупнасць якіх забяспечвае значны ўклад у распрацоўку актуальнай мастацтвазнаўчай праблемы выяўлення жывапіснай спадчыны, якая перажыла складаныя гістарычныя перыяды, з перспектывамі яе актуалізацыі ў мастацтве Беларусі.

Дысертацыя А.М. Сінілы «Сюжэтна-тэматычныя асаблівасці жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска» **адпавядае** патрабаванням, якія прад'яўляюцца да кандыдацкіх дысертацый, устаноўленых пунктаў 20, 21 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў ад 17.11.2004 № 560 (у рэдакцыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 02.06.2022 №190), а яе аўтару **можа быць прысуджана** вучоная ступень кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура.

Водгук на дысертацыю суіскальніка згодна загаду рэктара ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў» ад 18.05.2026 № 61 разгледжаны, абмеркаваны і зацверджаны на пасяджэнні Вучонага савета 4 чэрвеня 2026 года (пратакол № 6).

А.М.Сініла выступіў з дакладам па тэме дысертацыі «Сюжэтна-тэматычныя асаблівасці жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска» і адказаў на пастаўленыя пытанні і заўвагі.

На паседжанні прысутнічалі 17 членаў Вучонага савета. З іх 17 чалавек маюць вучоныя ступені (2 дактары, 15 кандыдатаў навук). Вучоныя званні маюць 11 чалавек (3 прафесар, 8 дацэнтаў).

Вынікі галасавання: «за» – 17, «супраць» – 0, «устрымаліся» – 0.

Даецца згода на размяшчэнне водгуку на сайце Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Эксперт апаніруючай арганізацыі
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт — Я.Ф. Шунейка

Старшыня Вучонага савета,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт — А.А. Ротмірава

Сакратар Вучонага савета,
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт — А.М.Гаўрылава

АДДЗЕЛ КАДРАЎ

ПОДПІС СВЕДЧУ
інспектар аддзела кадраў
С.А.Залноўская
04.06 2026 г.